# У НАС НОВАЯ КАЛЕГА

**Рашэннем Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі ад 25 студзеня 2024 года калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыі папоўніла паэтэса з Гродна Кацярына КАЛАМІЙЦАВА. Кандыдатура атрымала адзінагалоснае адабрэнне членаў Прэзідыума СПБ.**

Ігнацюк Кацярына Аляксееўна (творчы псеўданім Кацярына Каламійцава) нарадзілася 28 студзеня 1981 года ў горадзе Гродна. Скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка па спецыяльнасцях «Дэфекталогія» («Лагапедыя»), «Практычная псіхалогія» з прысваеннем кваліфікацыі педагог-лагапед, псіхолаг ва ўстановах адукацыі. Маці трох сыноў. Вершы піша з дзяцінства. Першая публікацыя адбылася ў 1994 годзе ў Навагрудскай раённай газеце «Новае жыццё», а ў 1995 годзе выйшла радыёперадача з удзелам юнай паэтэсы. Пасля працяглай паўзы вярнулася да літаратурнай творчасці ў сталым узросце. У 2019 годзе нізка вершаў Кацярыны была апублікаваная на літаратурным партале краін СНД «Созвучие», а ў студзені 2020 года яе верш «Рождественская ночь» прынёс перамогу ў Рэспубліканскім літаратурным конкурсе «Под рождественским небом». У 2022 годзе паэтэса Кацярына Каламійцава становіцца пераможцам IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі «Адкрыццё года». Публікацыі твораў гродзенскай паэтэсы можна сустрэць на старонках перыядычных выданняў Беларусі і Расіі, у калектыўных зборніках і альманахах. Аўтар зборнікаў лірыкі «Нет Никого Кроме Него» (2022) і «Женщина в красном» (2022). Тым, хто сочыць за літаратурным жыццём Прынёмання, імя Кацярыны Каламійцавай ужо знаёмае. Дзейнасць нашай новай калегі – прыклад таго, што праца сучаснага літаратара не абмяжоўваецца тэкстамі і іх публікацыямі, а перш за ўсё, гэта прамы адкрыты дыялог з грамадскасцю, актыўны пошук свайго чытача і новых шляхоў рэалізацыі ўласнага творчага патэнцыялу. Паэтэса гатовая да паездак па вобласці і рэспубліцы, да новых знаёмстваў і ўражанняў, да пашырэння кругагляду і ўдасканалення свайго майстэрства. Піша на рускай мове.



**Кацярына Аляксееўна Ігнацюк (Кацярына Каламійцава)**

Па сцвярджэнні спецыялістаў, творы паэтэсы Кацярыны Каламійцавай адрозніваюцца асаблівай сакральнасцю спасціжэння свету, яго маральна-каштоўнасным эстэтычным вымярэннем. Хрысціянская вера і жаночая любоў – жыццесцвярджальныя культы быцця яе лірычнай гераіні. Творчасць паэтэсы арыгінальная не столькі эмацыйна-пачуццёвым пачаткам, колькі глыбокай філасофіяй мыслення, што заўсёды правакуе чытача і слухача да пазнання свету і сябе ў гэтым свеце, да самавыяўлення асобаснага пачатку, у чым і заключаецца высокі сэнс мастацтва.

Кацярыне Каламійцавай уласцівыя энергічнасць, камунікабельнасць, дружалюбнасць, а таксама прагрэсіўны светапогляд, шырокі спектр захапленняў, трывалая пазіцыя сапраўднага грамадзяніна, патрыёта сваёй Радзімы.

Сардэчна віншуем Кацярыну Аляксееўну Ігнацюк (Кацярыну Каламійцаву) з уступленнем у шэрагі грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», жадаем моцнага здароўя, невычэрпнай творчай энергіі і плёну на карысць народа Беларусі, яе багатых культурных традыцый.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**